УДК: 61:615.1(043.2)
ББК: 5:52.8
ISBN: 978-985-21-0532-3


***Макеенка К.С.***

**СЛОВЫ ЯК ПАНАЦЭЯ**

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Ратынская Н.В.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Медыцына не стаіць на месцы і працягвае развівацца. Але і ў наш час выкарыстоўваюцца метады, якія зарадзіліся ў старажытнасці.

Спакон вякоў, калі чалавек хварэў, ён пачынаў з самалячэння. Прасцейшымі спосабамі і сродкамі бытавой традыцыйна-вуснай медыцыны валодала амаль кожная сям’я. Калі гэтыя сродкі не дапамагалі, звярталіся да тых медыкаў-прафесіяналаў, а часцей непрафесіяналаў, хто браўся за лячэнне. Тых людзей, якія валодалі шматвяковым народным вопытам лячэння, называлі «чараўнікамі», «варажбітамі», «знахарамі». Значная частка такіх людзей аддавала перавагу замовам і заклінанням, якія маглі аказваць псіхатэрапеўтычны эфект. А пачалося ўсё з веры ў звышнатуральныя сілы прадметаў, у сілу слова. Тады і з’явілася такое паняцце, як замовы, якімі займаліся знахары. А замовы якраз і складаліся са слоў, якія, як верылі, аказвалі аздараўленчую сілу. У кожнага народа свае асаблівасці ў "шаптанні", але самая галоўная – гэта мова, на якой загаворваюць. Першапачаткова замовы былі ў выглядзе малітвы, але потым паступова замяніліся на зварот да вышэйшых сіл на сваёй мове. У дадзенай працы гаворка пойдзе аб выкарыстанні ў замовах беларускай мовы.

Нягледзячы на развіццё новых тэхналогій лекавання, нават у цяперашні час звяртаюцца да народнай медыцыны і лячэння сілай слова. Гэтаму спрыяе мноства прычын: жаданне людзей лячыцца толькі народнай медыцынай, боязь выкарыстання чагосьці новага замест звыклага і праверанага часам, старога. Таму пытанне аб нетрадыцыйных метадах лячэння актуальнае і ў наш час.

репозиторий БГМУ